**Irena Chowańska**

# Штрыхі да творчага партрэта Міхася Стральцова : (з нагоды 75-годдзя з дня нараджэння майстра)

Acta Polono-Ruthenica 16, 21-32

2011

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

ISSN 1427-549X

Irena Chowańska
Olsztyn

# Штрыхі да творчага партрэта Міхася Стральцова (З нагоды 75-годдзя з дня нараджэння майстра)

Як хутка ляціць час! Здаецца, зусім нядаўна ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў адбыўся вечар памяці Міхася Стральцова, а ў беларускай перыёдыцы з гэтай нагоды паўстала некалькі артыкулаў[1] прысвечаных яго творчасці. Аднак, з той пары прайшло ўжо больш як чатыры гады. Надыходзячы 2012 год можна будзе назваць годам Міхася Стральцова, таму што 14 лютага споўнілася бы 75 гадоў Міхасю Лявонавічу Стральцову – пісьменніку, які выказаўся не толькі ў прозе, але і ў паэзіі, крытыцы, эсэістыцы і перакладах. Усё што напісана Стральцовым уваходзіць у беларускую літаратуру, вылучаецца арыгінальнасцю і своеасаблівым лірызмам, званым „стральцоўскім".

Міхась Стральцоў пачаў пісаць ужо ў школьныя гады. Яго першыя вершы напісаныя на рускай мове друкаваліся ў часопісе „Прамень" і газеце „За Радзіму". Празаічны дэбют Стральцова адбыўся ў 1957 годзе беларускамоўным апавяданнем *Дома*[2]. Праз пяць гадоў пасля апублікавання свайго першага празаічнага твора, пісьменнік выдаў зборнік прозы *Блакітны вецер*[3], у які ўвайшлі сем апавяданняў: *Дома* (1957), *Восеньскі ўспамін* (1958), *Мацеевы дровы*[4] (1959), *Блакітны вецер* (1960), *Двое ў лесе* (1960),

---

[1] А. Мяснікоў, *Міхась Стральцоў*, „Звязда" 14.02.2007, с. 6; А. Бадак, *Зорка Міхася Стральцова*, „Літаратура і мастацтва" 16.02.2007, с. 15; У. Дамашэвіч, *Яшчэ адна загадка*, „Літаратура і мастацтва" 16.02.2007, с. 15; І. Гоўзіч, *„Калі маўчыць душа, гібее розум наш..."*, „Роднае слова" 2007, № 2, с. 35–43; В. Бурло, *Стылістычныя прыёмы адлюстравання рэчаснасці ў апавяданні Міхася Стральцова „Смаленне вепрука" (1973)*, „Веснік БДУ 2007", 2, сер. 4, с. 24–28; І. Гоўзіч, *„Казкі жыцця" Якуба Коласа і стылёвыя пошукі літаратуры другой паловы XX ст. (на прыкладзе творчасці прадстаўнікоў „філалагічнага пакалення")*, [у:] *Янка Купала і Якуб Колас у сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя. Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск 26–27 верасня 2007*, с. 137–142.

[2] М. Стральцоў, *Дома*, „Маладосць" 1957, № 1, с. 20–24.

[3] М. Стральцоў, *Блакітны вецер. Апавяданні*, Мінск 1962.

[4] Апавяданне *Мацеевы дровы* сустракаецца пад назвамі *Пасля каляд* (М. Стральцоў, *На ўспамін аб радасці. Выбранае*, Мінск 1974) і *Пасля завірухі* (М. Стральцоў, *Выбраннае. Проза. Паэзія. Эсэ*, Мінск 1987).

*Суседзі*[5] (1961) і *Перад дарогай* (1961). На кнігу Стральцова адразу звярнулі ўвагу крытыкі і даследчыкі беларускай літаратуры, якія неаднойчы гаварылі пра талент маладога творцы, увайшоўшага ў літаратуру са сваёй тэмай, стылем і бачаннем свету[6].

Другая кніга прозы Міхася Стральцова, *Сена на асфальце*[7], выйшла ў 1966 годзе і таксама хутка была заўважана крытыкай[8]. Кніга складаецца з адзінаццаці апавяданняў: *На вакзале чакае аўтобус* (1962); *Трыпціх* (1963); *Там, дзе зацішак, спакой* (1963); *Сена на асфальце* (1963); *Добрае неба* (1964); *На чацвёртым годзе вайны* (1964); *Што будзе сніцца* (1964); *Роздум* (1964); *Дзень у шэсцьдзесят сутак* (1964); *І зноў, зноў горад*[9] (1965) і *Свет Іванавіч, былы донджуан* (1965). Найбольш вядомым з ніх з'яўляецца *Сена на асфальце*. У гэтым творы пісьменнік узняў некалькі праблем, адной з найважнейшых для яго была тэма духоўнай сувязі паміж вёскай і горадам. Аб тым, што тэма вёскі і горада займала важнае месца ў творчасці Стральцова, сведчыць шэраг твораў напісаных у розныя гады, якую таксама яскрава прадставіў у апавяданнях *Дома*, *Перад дарогай*, *На вакзале чакае аўтобус*, *Трыпціх* і *Смаленне вепрука*. Вобраз вёскі і горада раскрываецца ў творах праз узаемаадносіны герояў, дзякуючы ім чытач даведваецца пра адносіны людзей рознага веку да горада і вёскі. Чытаючы апавяданні Стальцова насоўваюцца пытанні аб тым, навошта выбіраць паміж вёскай і горадам, навошта рабіць выбар? Такія пытанні таксама задае сабе і шукае на іх адказ галоўны герой *Сена на асфальце* – Віктар, які з'яўляецца жыхаром сучаснага горада, але па паходжанні і па ладзе мыслення ён – вясковец. Малады аспірант вельмі хоча прымірыць горад з вёскай, бачачы перавагі жыцця і ў горадзе, і ў вёсцы. Нездарма ён упамінае высокае неба, палёт на самалёце і тэхніку, без якой не мог бы хутка

[5] У 1985 годзе М. Стральцоў дапрацаваў раней напісанае апавяданне *Суседзі* і змяніў яго назву. Твор пад назвай *Волька* ўвайшоў у склад апошняй кнігі пісьменніка (М. Стральцоў, *Выбраннае. Проза. Паэзія. Эсэ*, Мінск 1987).

[6] Гл: А. Гардзіцкі, *Зборнік выклікае роздум*, „Звязда" 21.08.1962, с. 6; А. Вярцінскі, *Ці існуе блакінты вецер?*, „Літаратура і мастацтва" 31.08.1962, с. 6; Б. Бур'ян, *Першы крок – пачатак дарогі*, „Беларусь" 1962, № 11, с. 28; Я. Цыбук, *З адчуваннем прыгожага*, „Полымя" 1962, № 12, с. 164–166; М. Кацюшын, *Апраўданыя падзеі*, „Мінкая праўда" 1.09.1962, с. 4; К. Сянько, *Аб кнізе М. Стральцова „Блакітны вецер"*, „Чырвоная змена" 22.01.1963, с. 6; Б. Фиртшейн, *Сквозь призму*, „Знамя юностн" 1.08.1963, с. 5.

[7] М. Стральцоў, *Сена на асфальце. Апавяданні*, Мінск 1966.

[8] Д. Бугаёў, *Таленавітае і аднастайнае*, „Полымя" 1966, № 12, с. 171–175; В. Нікіфаровіч, *Кніга і яе героі*, „Беларусь" 1967, № 3, с. 26; В. Никифорович, *Спросить себя...*, „Неман" 1969, № 3, с. 160–162.

[9] Спачатку апавяданне мела назву *Госць* і было надрукавана ў 1965 годзе ў часопісе „Полымя" (№ 5–6, с. 106–111). Пазней Стральцоў змяніў гэту назву на *І зноў, зноў горад*.

пераадолець далёкія адлегласці. Побач з рэактыўным самалётам ён бачыць жаваранка і не хоча выбіраць паміж ім і тэхнікай.

Варта згадаць, што вобраз вяскоўца, стаўшага гараджанам, з'яўляецца ў творах амаль ва ўсіх пісьменнікаў блізкага да стральцоўскага і пазнейшых пакаленняў. Але Міхась Стральцоў быў першым з літаратараў, які ў беларускай прозе прадставіў тып героя, якому адначасова блізкія горад і вёска. Стральцоўскі герой балансуе паміж любоўю да вёскі і горада. Для яго галоўным было адчуць душэўную раўнавагу і спакой і неістотна было, што стане прычынаю таго – горад ці вёска.

Як вядома, Стальцоў быў не адзіным пісьменнікам у беларускай літаратуры, які ў 60-х гадах ХХ стагоддзя закранаў тэму вёскі. Пра вясковае жыццё пісалі пераважна Іван Пташнікаў, Вячаслаў Адамчык, Анатоль Кудравец, Павел Місько, Вера Палтаран і інш. Тэма вёскі была таксама актуальнай і для рускіх пісьменнікаў: Віктара Астафьева, Васілія Бялова, Яўгена Носава, Валянціна Распуціна, Віктара Ліханосава, Васіля Шукшына і інш. Як адзначае даследчык Арнольд Макмілін: „у рускай вясковай прозе адбываўся своеасаблівы адыход ад урбаністычнай традыцыі, дзе зварот ад гарадскога да сельскага жыцця нёс за сабой моцны настальгічны зарад, ідэалізацыю мінулага і схільнасць да непрымання сучасных працэсаў”[10]. У большасці твораў таго перыяду адлюстроўваліся палітычныя і псіхалагічныя змены жыцця вёскі і горада, іх будзённае жыццё, а таксама паяўлялася параўнанне экзістэнцыі ў вёсцы і горадзе. Вёска ўспрымалася як малая радзіма, як адвечная каштоўнасць чысціні, дабрыні і маральнасці. Усё, што датычылася вёскі, мела ідылічны характар, горад жа быў часта ўвасабленнем усяго злога і кепскага. У значнай ступені, аднак, іншы падыход у асэнсаванні дадзенай праблематыкі выяўляецца ў творах М. Стральцова. Пісьменнік паказваў вёску і горад без кантраснага параўнання, адначасова даваў ім характарыстыку, выпукляў тое вартаснае, на чым трымаецца жыццё ў іх.

У 1966 годзе Стральцоў напісаў аповесць *Адзін лапаць, адзін чунь*[11]. Праз тры гады яна выйшла асобным зборнікам[12] і была адзначана прэміяй часопіса „Дружба народов”. Аповесць належыць да самых доўгіх лірычных твораў пісьменніка і з'яўляецца другім творам[13], дзе дасканала прадстаўлена

[10] А. Макмілін, *Беларуская літаратура ў 50–60-я гады ХХ стагоддзя*, Мінск 2001, с. 152.

[11] М. Стральцоў, *Адзін лапаць, адзін чунь, Аповесць*, „Маладосць” 1966, № 12, с. 52–93.

[12] М. Стральцоў, *Адзін лапаць, адзін чунь, Аповесць*, Мінск 1970.

[13] Першым творам было апавяданне *На чацвёртым годзе вайны*, дзе прадстаўлена ваеннае дзяцінства, душэўная драма сямігадовага хлопчыка, яго бабулі і маці.

тэма пасляваеннага дзяцінства, пачуцці малога хлопчыка і дарослых асоб. Галоўнае месца ў аповесці *Адзін лапаць, адзін чунь* займае духоўнае жыццё дзеда Міхалкі і яго ўнука, якое надае аповесці асаблівую лірычнасць.

Апошняе апавяданне Міхася Стральцова *Смаленне вепрука*, напісанае ў 1973 годзе, займае важнае месца ў творчасці пісьменніка. Даследчыкі і крытыкі зазначалі, што гэтае складанае і захапляльнае апавяданне было сапраўдным наватарскім творам беларускай літаратуры 70-х гадоў. У ім яскрава вылучаецца асабістае і шчырае аўтарскае „я". Апавядальнік адкрыта гаворыць пра свае мары, успаміны, сон, пра прыгажосць восені, пра шум і пах лесу. У апавяданні таксама апісваецца нараджэнне і працэс напісання твора, раскрываецца незадаволенасць аўтара магчымасцямі празаічных жанраў. Хочацца ўзгадаць тут сцвярджэнне даследчыка Вячаслава Івашчанкі, што *Смаленне вепрука* „кампазыцыйна нагадвае верш: асобныя фрагменты гэтага твора – то апавяданне „напрамую", то расшыфроўка падтэксту, то разважанне-роздум – акаймоўваюцца своеасаблівымі думкамі-"рыфмамі", якія збіраюць гэтую філасоўскую паэму ў адно, падкрэсліваюць сувязь і пераклічку матываў, думак, адчуванняў"[14].

Апавяданнем *Смаленне вепрука* Міхась Стральцоў развітаўся з прозай, пакінуўшы ў ёй свой „стральцоўскі" след. Не будзе перабольшваннем сказаць, што Стральцоў валодаў рэдкім дарам: ён умеў на некалькіх старонках твора сказаць пра многае, перадаць думкі і пачуцці героя, не засяроджваўся на дакладным апісанні падзей і вонкавым выглядзе герояў. Амаль усе творы Стральцова насычаны сумным і трывожным лірызмам. Яны заклікаюць чытача да роздуму пра духоўную сувязь паміж вёскай і горадам, пра супярэчнасць паміж імі, да шанавання традыцый, паважання чалавечай дабрыні і працавітасці. У творах Стральцоў закранаў шэраг значных пытанняў такіх, як творчая самарэалізацыя чалавека, цяжкасці станаўлення асобы, супярэчнасці кахання і цяжкасці пасляваеннага жыцця.

Герой Стральцова – гэта часцей за ўсё малады, адукаваны мужчына[15], які жыве ў сучасным горадзе, але па свайму паходжанні ён з'яўляецца вяскоўцам. Ён – інтэлігент, мае сваю жыццёвую вартасць, ідыялогію і філасофію. Гэта добрасумленны, працавіты і досыць самотны, уражлівы на людзей і прыроду мужчына знаходзіцца ў цяжкім моманце свайго жыцця. Ён задумваецца над тым, ці сапраўды ён здолеў знайсці сваё месца

[14] В. Івашчанка, *Чаканне радасці*, „Полымя" 1977, № 5, с. 201.

[15] Аналізуючы ўсю прозу Стральцова, заўважаем, што сярод дваццаці аднаго твора (дзевятнаццаці апавяданняў і дзвюх аповесцяў), у дваццаці творах месца галоўнага героя займае мужчына і толькі ў адным апавяданні *Суседзі* – жанчына.

на зямлі, свой дом, ці тое, што ён робіць, насамрэч прыносіць карысць грамадству, што прыносіць яму радасць і завальненне, ці адчувае ён сувязь з сям'ёй, калектывам, працай і прыродай. Неаднакратна герой Стральцова крытыкуе сам сябе, вядзе змаганне са сваім „я", аналізуе сваё захаванне і жыццё, сцвярджаючы, што павінен змяніць сваю жыццёвую ідыялогію. Ён адкрыта гаворыць пра любоў да роднай вёскі і бацькоўскага кута. Даследчыкі беларускай літаратуры Леанід Баршчэўскі, Пётр Васючэнка і Міхась Тычына зазначаюць, што „стральцоўскі герой выбірае свой шлях адзінокага сузіральніка жыцця і яго шматлікіх праяў, які востра адчувае крохкасць светабудовы і імгненнасць зямнога існавання. Ён увесь час адчувае сябе на скрыжаванні супрацьлеглых настрояў і кантрастных паняццяў: то кідае ўсё і едзе ў родную вёску („Там, дзе зацішак, спакой"), то вяртаецца ў горад, нагружаны вясковымі ўражаннямі („На вакзале чакае аўтобус"), то акунаецца ва ўспаміны пра дзяцінства, калі вучыўся „быць па-чалавечы добрым і мужным" у мудрага дзеда Міхалкі, і прычашчаецца да вытокаў жыцця („Адзін лапаць, адзін чунь"). Гэтак вонкава выяўляецца незадаволеннасць героя самім сабою і неўладкаваным светам, бясконцае імкненне да нечага высокага, духоўнага, сэнсоўнага, – таго, што мае розныя імёны „шчасце", „поўнага жыцця", „гармонія", „лад"[16].

Варта зазначыць, што Міхась Стральцоў, у адрозненні ад пісьменнікаў, якія пісалі ў 60-х і 70-х гадах XX стагоддзя, здолеў выйсці за межы свайго пакалення, ствараючы арыгінальнага героя, адкрываючы яго ўнутраны свет і этапы яго духоўнага развіцця. Стральцоў не канцэнтраваўся на дэтальным апісанні вонкавага выгляду героя, толькі на яго ўнутранным свеце. Дзякуючы падрабязнаму апісанню думак героя, пачуццяў і захаванняў выяўляецца яго характар і адносіны да навакольнага асяроддзя. Усе героі Стральцова ствараюць цудоўную калекцыю мужчынскіх і жаночых вобразаў і безумоўна з'яўляюцца трывалым элементам у празаічнай творчасці гэтага беларускага пісьменніка.

Міхась Стральцоў хутка сцвердзіў сябе не толькі як выдатны пісьменнік, але таксама, як таленавіты паэт, перакладчык, эсэіст і крытык. Ужо на пачатку 70-х гадоў Стральцоў зноў пачаў пісаць вершы, якія былі сабраныя ў кнігах: *Ядлоўцавы куст*[17], *Цень ад вясла*[18], *Яшчэ і заўтра*[19]

[16] Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына, *Беларуская літаратура і свет. Ад эпохі рамантызму да нашых дзён. Папулярныя нарысы*, Мінск 2006, с. 464–465.

[17] М. Стральцоў, *Ядлоўцавы куст. Вершы*, Мінск 1973.

[18] М. Стральцоў, *Цень ад вясла. Вершы*, Мінск 1979.

[19] М. Стральцоў, *Яшчэ заўтра. Вершы*, Мінск 1983.

і *Мой свеце ясны*[20]. Даследчыца Вера Палтаран канстатавала, што вершы ўвашоўшыя ў склад першага зборніка паэзіі „цесна звязаны з усёю папярэдняй творчасцю Міхася Стральцова, думкамі, вобразамі, настроем, паэтыкай”[21]. Яна слушна зазначала, што для Стральцова вельмі характэрнымі з’яўляюцца „утаймаванне дысгармоніі эмацыянальным выбухам, пераадоленне душэўнай скрухі аптымізмам, пачэрпнутым у народным светаўспрыманні”[22]. Наступныя ж кнігі паэзіі Стральцова вылучаліся вялікім мастацкім пачуццём, тонкай эмацыянальнасцю, філасофскім развежаннем пра сэнс жыцця і экзістанцыйнай сутнасці чалавека. Паэт спрабаваў у вершах адказаць на пытанні, якія яго трывожылі, што і было характэрнай прыкметай яго творчасці. Варта зазначыць, што і ў паэзіі Стральцоў заставаўся самім сабой, ён не выходзіў за межы адпушчанага яму прыродай і лёсам, расказваў толькі пра тое, што сам перажыў і зразумеў у жыцці. Ён вяртаўся да прыроды, апісання вясковага жыцця і падрабязнага паказання вясковых звычаяў, традыцый і прылад працы: *Бацькаўшчына*[23], *Вяртанне* (с. 390 –391), *Напэўна гусі на бяду* (с. 424) і інш.

Безумаўна, паэзія займала важнае месца ў творчасці Міхася Стральцова. Тэма яго вершаў была такая, як і празаічных твораў – пра мінулую вайну, пра пасляваеннае гаротнае жыццё, пра нялёгкае дзяцінства, пра родную прыроду, пра гарадское і вясковае жыццё і пра іх жыхароў. Стральцоў пісаў вершы прысвечаныя жыццю, смерці, ролі майстра ў жыцці і ў творчасці, а таксама паэзіі і прозе, якія часам былі насычаны пачуццём смутку альбо радасці: *Мне спавядаўся чалавек* (с. 346); *Пра мудрасць* (s. 349); *Засцярога* (с. 342); *Прайшло, мінулася, як дым...* (с. 370); *Абнаўлення хачу я, хачу абнаўлення!* (с. 370); *Паяднай пачатак і канец...*(с. 373); *Думаў яшчэ нядаўна* (с. 389); *А будзе час, калі і без нагоды...* (с. 438); *Разам з людзьмі* (с. 438) і інш. Прысвячаў вершы Сымону Блатуну (*Партрэты*, с. 363–364), Рыгору Барадуліну (*Адгалоскі*, с. 374), Аляксею Пысіну (*Усім сказаць: была, была бамбёжка...*, с. 376), Валянціну Аскоцкаму (*У самых дальніх, дальніх гарадах...*, с. 385), Анатолю Вялюгіну (*Адвячоркам круціцца пласцінка...*, с. 413–414), Янку Купалу (*Купала*, с. 409) і Адаму Міцкевічу (*Міцкевіч на Беларусі*, с. 411). Лірычны ж герой у вершах Стральцова таксама як і ў прозе, заставаўся нязменным: тонка адчувальным і маральна патрабавальным, які неаднаразова

[20] М. Стральцоў, *Мой свеце ясны. Вершы*, Мінск 1986.

[21] В. Палтаран, *Чалавек прарастае горадам*, „Маладосць” 1974, № 6, с. 164.

[22] Ibidem, с. 166.

[23] М. Стральцоў, *Выбранае. Проза. Паэзія. Эсэ*, Мінск 1987, с. 409. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

атаясамліваўся з паэтам гаворачы, напрыклад: „Абнаўлення хачу я, хачу абнаўлення!" (с. 370); „Прысніўся верш – не верш, а два радкі" (с. 353), „Я хачу напісаць радок" (с. 340), „Люблю я прозы дух цвярозы... " (с. 371) альбо „Мне звышнадзённай тэмы не падняць..." (с. 381).

Гаворачы пра паэзію Міхася Стральцова трэба згадаць, што ніводны яго верш не пазначаны датай. Як вынікае з ліставання пісьменніка з Алай Сямёнавай[24], паэт не звяртаў увагі на даты, і нават лічыў, што стаўляць даты пад кожным вершам – гэта несур'ёзна. Аднак адсутнасць храналагічнага парадку ў вершах Стральцова стварала значную праблему падчас выдання кніг яго паэзіі і з'яляецца перашкодай для сучасных даследчыкаў яго паэтыцкай творчасці.

Варта ўзгадаць, што ў апошнім часе польскі чытач мог бліжэй пазнаёміцца з паэзіяй беларускага паэта Міхася Стральцова, якая ўвайшла ў склад *Antologii poezji białoruskiej od XV do XX wieku*[25]. Перакладам вершаў Стральцова на польскую мову займаліся Адам Паморскі і Чэслаў Сэнюх. Да 2008 года ў Польшчы былі апублікаваны на польскай мове чатыры творы пісьменніка. У 1968 годзе было надрукавана ў часопісе „Nowa Wieś" Апавяданне *Госць* (*Gość*)[26], якое пераклаў Леон Сусід. Год пазней выйшаў пераклад аповесці *Адзін лапаць, адзін чунь* (*Jeden chodak, jeden łapeć*)[27], а ў 1982 годзе – творы *Што будзе сніцца* (*Co się nam przyśni*)[28] і *Жалейка* (*Żalejka*)[29]. Зборнікі і асобныя творы Стральцова перакладаліся таксама на рускую, украінскую, балгарскую, англійскую, нямецкую, французскую і іншыя мовы.

Міхась Стральцоў не мог існаваць без літаратуры. Ён шмат чытаў, у кола яго чытацкіх інтарэсаў уваходзілі творы класікаў і сучаснікаў. Стральцоў уважліва сачыў за навінкамі, добра ведаў літаратурныя плыні і праз увесь час развіваў і ўдасканальваў свае творчыя здольнасці. Пісаў ён не толькі

---

[24] Гл.: А. Сямёнава, *Бэзавы попел*, „Крыніца"1994, № 9, с. 35–86.

[25] *Nie chyliłem czoła przed mocą. Antologia poezji białoruskiej od XV do XX wieku*, red. A. Chadanowicz, J. Dąbrowski, Wrocław 2008, c. 522–533. Гэты зборнік з'яўляецца адным з некалькі выданых праз Калегіум Усходняй Еўропы ім. Яна Новака-Езераньскага (Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego). Сустрэча з аўтарамі зборніка і беларускімі паэтамі адбылася ў некалькі польскіх гарадах. У Ольштыне сустрэча прайшла 18 чэрвеня 2008 года.

[26] M. Stralcou, *Gość*..., tł. L. Susid, „Nowa Wieś" 1968, nr 20, s. 10–11.

[27] M. Stralcou, *Jeden chodak, jeden łapeć*, tł. I. Szpak, „Literatura Radziecka" 1969, nr 11, s. 87–116.

[28] M. Stralcou, *Co się nam przyśni*, tł. A. Sambor, „Literatura na Świecie" 1982, nr 11, s. 127–131.

[29] M. Stralcou, *Żalejka*, tł. J. Huszcza, „Odgłosy" 1982, nr 20, s. 1.

апавяданні, аповесці і вершы, але таксама рэцэнзіі, эсэ і літаратурна-крытычныя артыкулы. Менавіта рэцэнзіі, літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ дапамагаюць зразумець творчы партрэт Міхася Стральцова.

Рэцэнзіі Стральцова друкаваліся як на старонках беларускіх газет і часопісаў („Літаратура і мастацтва”, „Полымя”, „Маладосць”, „Нёман”, „Беларусь”, „Настаўніцкая газета”), так і рускіх („Литературное обозрение”, „Литературная газета”, „Дружба народов”). Яго літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ увайшлі ў кнігі: *Жыццё ў слове*[30], *У полі зроку*[31], *Пячатка майстра*[32], *Выбранае*[33] і *Ад маладзіка да поўні*[34]. Стральцоў напісаў трыццаць шэсць літаратурна-крытычных артыкулаў і дваццаць шэсць эсэ[35], якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай літаратуры. Большая частка яго артыкулаў і эсэ прысвечана праблемам літаратуры і творчасці многіх паэтаў і пісьменнікаў. У полі яго зроку былі літаратары розных мастацкіх маштабаў, розных пакаленняў, напрыклад: Францішак Багушэвіч (*Дудар беларускі*[36]), Янка Купала (*На пачатку ўсіх пачаткаў*[37]; *Ад роднае зямлі*[38]; *Драма сям'і Зяблікаў*[39]; *Адказ на анкету*[40]), Якуб Колас (*На пачатку ўсіх пачаткаў*[41]; *Ад роднае зямлі*[42]), Цішка Гартны (*На нятоўранай сцежцы*[43]), Міхаіл Святлоў (*І жыццём і песняй*[44]), Раман Сабаленка (*Герой у шарачковай світцы*[45]), Васіль Вітка (*Настаўнік з вялікай літары*[46]), Аляксей Руцескі (*Душэўная думка паэта*[47]), Іван

[30] М. Стральцоў, *Жыццё ў слове. Літаратурна-крытычныя артыкулы* Мінск 1965. У складзе гэтага зборніка знаходзіцца дзесяць артыкулаў, два з іх (*Дудар беларускі*; *На пачатку ўсіх пачаткаў*) у наступных выданях былі пазначаны як эсэ.

[31] М. Стральцоў, *У полі зроку. Літаратурна-крытычныя артыкулы,эсэ*, Мінск 1976.

[32] М. Стральцоў, *Пячатка майстра. Літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ*, Мінск 1986.

[33] М. Стральцоў, *Выбранае. Проза. Паэзія. Эсэ*, Мінск 1987.

[34] М. Стральцоў, *Ад маладзіка да поўні, Апавяданні, аповесці, эсэ*, Мінск 2005.

[35] Да іх застала далучана аповесць *Загадка Багдановіча*, у якой вылучаюцца прыкметы, характэрныя для эсэ.

[36] М. Стральцоў, *Жыццё ў слове...*, с. 5–13.

[37] М. Стральцоў, *Ад маладзіка да поўні...*, с. 301–310.

[38] Ibidem, с. 314–323.

[39] М. Стральцоў, *Пячатка майстра...*, с. 19–24.

[40] М. Стральцоў, *У полі зроку...*, с. 99–102.

[41] М. Стральцоў, *Ад маладзіка да поўні...*, с. 301–310.

[42] Ibidem, с. 314–323.

[43] М. Стральцоў, *Жыццё ў слове...*, с. 83–102.

[44] М. Стральцоў, *У полі зроку...*, с. 86–90.

[45] М. Стральцоў, *Жыццё ў слове...*, с. 151–166.

[46] М. Стральцоў, *У полі зроку...*, с. 110–112.

[47] М. Стральцоў, *Жыццё ў слове...*, с. 54–80.

Мележ (*І пайшоў дарогай росту...*[48], *Высокі ўзлёт*[49]), Іван Чыгрынаў (*Свой агульны клопат*[50]), Рыгор Барадулін (*...І абяцанне новых адкрыццяў*[51]; *Ад маладзіка да поўні*[52]), Уладзімір Някляеў (*Сталення строгая пара*[53]), Алесь Жук (*Рунь халадоў не баіцца*[54]) і інш. Аднак найбольш цікавым майстрам слова для Стральцова быў Максім Багдановіч. Творчасць наймалодшага класіка беларускай літаратуры і яго „парыванні да гармоніі і красы былі вельмі сугучны"[55] з пошукамі самаго Міхася Стральцова і безумоўна пасадзейнічалі ідэі напісання аповесці *Загадка Багдановіча*[56]. У гэтым творы пісьменнік умела спалучыў літаратурную выдумку з прыкметамі, характэрнымі для навуковай працы, эсэ і паэзіі, якія былі нетыповымі для беларускай літаратуры таго часу. Даследчыкі і крытыкі неаднаразова ў сваіх працах канстатавалі, што *Загадка Багдановіча* мае ўсе прыкметы ўласцівыя эсэ, у ім выступаюць „сціпласць формы і ёмістасць зместу, раскаванасць думкі і натуральнасць пісьма, свабода кампазіцыі і афарыстычнасць стылю, індывідуальнасць інтанацыі і лірычная ўсхваляваннасць"[57].

У аповесці *Загадка Багдановіча* Міхась Стральцоў паказаў свайго Максіма Багдановіча, а яго творчы і жыцёвы шлях паставіў побач з Янкам Купалам і Якубам Коласам. Крытык прадставіў чытачу „феномен Багдановіча", які пражываючы ад малога ў рускамоўным асяроддзі дасканала пісаў на беларускай мове і ў дваццаць гадоў ужо стаў класікам беларускай літаратуры. Стральцоў паказаў Багдановіча не толькі як паэта, але як чалавека і грамадзяніна, адданага сваёй радзіме і матчынай мове.

Пералік імён пісьменнікаў і паэтаў, аб якіх Міхась Стральцоў пісаў літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ, сведчыць аб шырыні яго творчых інтарэсаў. Даследчыкі літаратуры ў сваіх артыкулах неаднаразова звярталіся да прац Стральцова зазначаючы, што ён „пісаў свабодна, даваў аб'ектыўныя ацэнкі літаратурным з'явам, многія з якіх не страцілі значэнне

[48] Ibidem, с. 167–189.
[49] М. Стральцоў, *Пячатка майстра...*, с. 51–63.
[50] Ibidem, с. 151–157.
[51] М. Стральцоў, *У полі зроку...*, с. 128–136.
[52] М. Стральцоў, *Пячатка майстра...*, с. 108–136.
[53] Ibidem, с. 147–150.
[54] Ibidem, с. 175–177.
[55] *Праблемы сучаснай беларускай крытыкі*, рэд. Т. К. Грамадчанка, А. С. Гурская, Л. М. Гарэлік, Мінск 1996, с. 135.
[56] М. Стральцоў, *Ад маладзіка да поўні...*, с. 224–294.
[57] *Праблемы сучаснай беларускай крытыкі...*, с. 135.

і актуальнасць у нашыя дні”[58], што ў яго артыкулах знаходзяць адлюстроўванне „літаратуры розных мастацкіх маштабаў, розных пакаленняў, розных выяўленчых школ”[59], а крытыка „пазначана рысамі даверлівасці і інтымнасці”[60], якая выяўляецца ў яго паэзіі. Літаратураведы таксама згадвалі, што „адносіны аўтара да чужых тэкстаў споўненыя той мерай далікатнасці, якой не заўсёды дасягаюць літаратуразнаўцы-прафесіяналы. А прага першаадкрыцце, пераадоленне літаратурнай другасці, якая аб’ектыўна спадарожнічае літаратурна-крытычнай творчасці, надаюць непаўторнасць асобе М. Стральцова-крытыка”[61].

Міхась Стральцоў акрамя пісання прозы і паэзіі, перакладаў на беларускую мову творы грузінскіх[62], іспанскіх[63], літоўскіх[64], нямецкіх[65], рускіх[66],

---

[58] І. Гоўзіч, *Мастацкі свет Міхася Стральцова*, [у:] *Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (да 80-годдзя НАН Беларусі)*, Мінск 2008, с. 181.

[59] А. Сямёнава, *Гарачы след теленту. Літаратурна-крытычныя эцюды*, Мінск 1979, с. 85.

[60] П. Васючэнка, *Міхась Стральцоў (1937–1987)*, [w:] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя*, у 4 т., Мінск 2003, т. 3, кн. 2, с. 423–424.

[61] Ibidem, с. 424.

[62] Н. Думбадзе, *Люлю, Віёла і Хемінгуэй*, „Задача” 1967, № 206; Э. Кіліяні, *Залатыя рызы*; С. Клдзіяшвілі, *Далёкія зарніцы*; Р. Коркія, *Студэнт*; Г. Рчавушвілі, *Павольнае танга*; Г. Шатберашвілі, *Мамалхінэ*; *Бэлька – аснова*, [у:] *Горны вадаспад*, Мінск 1967; Н. Думбадзе, *Люлю, Віёла і Хэмінгуэй*, „Беларусь” 1982, № 10.

[63] Ф. Мухамадзіеў, *Таварыскі суд. Апавяданне*, [у:] *Далягляды*, Мінск 1976; П. Нэруда, *Іншы*; *Яшчэ адзін*; *Герой*; *А ўсё-такі існую*; *Успаміны пра дружбу*; *Ранак, настоены на паветры. Вершы*, [у:] Нэруда П., *Крыві бунтоўнай кроплі*, Мінск 1976; П. Неруда, *Ранак, настоены на паветры*; *Герой*; *Жоўтае сэрца*; *Яшчэ адзін верш*, „Літаратура і мастацтва” 7.05.1976; Н. Гільён, Гітара, „Полымя” 1978, № 8.

[64] М. Слуцкіс, *Сярэбраны грошык: навэла дзіцячых год*, „Літаратура і мастацтва” 20.09.1958; В. Спудас, *Радок песні*; *Ранак ў лесе*; *„Значыць, забудуць?...”*; *Маленства*; *Сосны*, [у:] *Літоўская савецкая паэзія*, т. 1, Мінск 1977; А. Табіюнас, *Не для ёлак пяе лесаруб...*; *Па-мастацку ружовым чарнілам...*; *Іхняя праўда шэптам...*; *Спагада*, [у:] *Літоўская савецкая паэзія*, т. 2, Мінск 1977.

[65] П. Шуут, *Хвала рэвалюцыі*, „Літаратрура і мастацтва” 18.04.1980.

[66] М. Грыбачоў, *Жнівеньскія зоры. Апавяданне*, „Літаратура і мастацтва” 11.08.1961; М. Грыбачоў, *Жнівеньскія зоры. Апавяданне*, „Мінская праўда” 18.08.1961; А. Адамовіч, *Прашу цябе, выплыві. Урывак з аповесці „Ася”*, „Літаратура і мастацтва” 22.01.1965; В. Тарас, *Нос адзіноты. Апавяданне*, „Полымя” 1965, № 12; А. Адамовіч, *Вікторыя. Аповесць*, „Маладосць” 1966, № 1; П. Юрэвіч, П. Кабзарэўскі, *Бронзавая магіла. Гістарычная быль*, „Маладосць” 1969, № 8; М. Мусіенка, *Пасля работы. Апавяданне*, „Літаратура і мастацтва” 22.10.1971; Я. Смелякоў, *„Калі памру – і будзе ж недзе!...”. Белая вежа*, Мінск 1973; Я. Смелякоў, *Роздум ля навагодняй ёлкі*; *Нацыянальныя рысы*, „Полымя” 1974, № 11; М. Браўн, *„У цішы начнога саду...”*; *Маёй маці*; *„Як выбухі ноч скаланалі...”*; *Вяртанне*, [у:] М. Браўн, *Ленінградскае неба*, Мінск 1977; Г. Ханджэр, *Кватэра вокнамі на Амур. Аповесць*, [у:] *Братэрства*, Мінск 1983; А. Шаўкута, *Ачмурэлы Лайкоў. Апавяданне*; Я. Хелемскі, *Успаміны над Карскім морам*, [у:] *Братэрства*, Мінск 1984; У. Салаухін, *„Наша пані”*; *Двадцаць пяць на дваццаць пяць*; *Паўла. Апавяданні*, [у:] У. Салаухін, *Пад адным дахам*, Мінск 1984; Ч. Айтматаў, *Буранны паўстанак. Вякуе дзень даўжэй за век. Раман*, Мінск 1987.

армянскіх[67], узбекскіх[68], італьянскіх[69] і яўрэйскіх[70] паэтаў і пісьменнікаў. Ён працаваў да апошняй хвіліны. Яшчэ перад смерцью паэт здолеў пабачыць свае две апошнія кнігі з выбранымі творамі[71].

Міхась Стральцоў адышоў з жыцця нечакана, знясілены цяжкай невылячальнай хваробай у 50 гадоў, 23 жніўня 1987 года[72]. Адышоў ён у росквіце творчых сіл, пакідаючы ў спадчыну наступным пакаленням свае адметныя і непаўторныя творы. Памяць пра таленавітага майстра беларускай літаратуры – Міхася Стральцова жыве і будзе жыць. Пра гэта сведчыць прысвоенае пісьменніку ў 1988 годзе пасмертнае званне Лаўрэта Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы, вышадшая ў свет кніга выбраных твораў Стральцова[73], друкаваныя амаль кожны год навукова-крытычныя працы прысвечаныя яго творчасці і заснаваная ў студзені 2011 года з ініцыятывы паэта Уладзімера Някляева стыпендыя імя Міхася Стральцова[74]. Праводзіліся і будуць праводзіцца вечары Міхася Стральцова, вось толькі шкада, што сёння прыйшоўшы на такі вечар, немагчыма будзе ўбачыць майстра і паслухаць яго.

---

[67] М. Аразі, *Сонца. Таварыш Мукуч*, Мінск 1964; В. Татавенц, *Зноў у гэты пракляты горад. Маран. Апавяданні*, Мінск 1964.

[68] Д. Абдулаханаў, *Сухі стэп. Узбекскія апавяданні*, Мінск 1966; У. Умарбекаў, *Падарунак. Апавяданне*, „Маладосць” 1967, № 5.

[69] Э. Акрока, *Я нашу ў сабе...*; *Вечара мелодыі няўлоўныя...*; Н. Балестрыні, *Прытча бежанца*; *Такім чынам*; А. Барленгі, *Віртуозная гульня*; *Апушчаная фіранка*; К. Віла, *Усё адно ўсхвалілі б газеты...*; Э. Мантале, *Узбярэжная*; *Твой парыў*; Ф. Мантэроса, *Свабода – кажу яшчэ раз*; Э. Пальярані, *Галіафы вячэрняй*; М. Сакратэ, *Смог*, [у:] *Ад вежаў Ферары*, Мінск 1974; К. Віла, *Усё адно ўсхвалілі б газеты...*; *І дзяржаўным мужам даводзіцца...*; М. Сакратэ, *Смог*; Ф. Мантэроса, *Свабода, кажу яшчэ раз*; „Полымя” 1974, № 12.

[70] Х. Мальцінскі, Р. Рэлес, *Аднаактовыя п’есы*, Мінск 1964.

[71] М. Стральцоў, *Падарожжа за гарад. Апавяданні і аповесць*, Мінск 1986 і М. Стральцоў, *Выбранае. Проза. Паэзія. Эсэ*, Мінск 1987.

[72] Магіла М. Стральцова знаходзацца ў Мінску на Чыжоўскіх могілках.

[73] У 2005 годзе, у 18-годдзе са дня смерці Міхася Стральцова, выйшаў зборнік выбраных твораў майстра (М. Стральцоў, *Ад маладзіка да поўні. Апавяданні, аповесці, эсэ*, Мінск 2005). Ініцыятарам гэтага выдання была дачка пісьменніка Вераніка Міхайлаўна Стральцова.

[74] Заснаваная стыпэндыя імя пісьменніка Міхася Стральцова 12 студзеня 2011 года была ўручана упершыню. Стыпэндыю атрымаў другакурснік Эўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта Антон Уласенка, які напісаў эсэ *Мой народзе*.

Гл.: [online] <www.svaboda.org/content/article/2274305.html>; 20.02.2011г.

**Streszczenie**

*Szkice do twórczego portretu Michasia Stralcowa*
*(W 75. rocznicę urodzin mistrza)*

Niniejszy artykuł powstał z myślą o obchodzonej 14 lutego 2012 roku 75. rocznicy urodzin nie żyjącego już dziś wybitnego prozaika, poety, tłumacza, eseisty i krytyka literackiego Michasia Stralcowa. Artykuł stanowi przegląd całej twórczości znakomitego twórcy literatury białoruskiej drugiej połowy XX wieku. Podkreśla się w nim, że Michaś Stralcow był niezwykle utalentowanym literatem, który w pełni wykazał się w prozie, poezji i eseistyce.

**Summary**

*Studies for the creative portrait of Michas Stralcow*
*(on the master's 75th birthday anniversary)*

The present article came into being with a view to the 75th birthday anniversary of the already deceased outstanding prose writer, poet, translator and literary critic Michas Stralcow, to be celebrated on 14 February 2012. The article constitutes a review of the whole literary output on the part of the brilliant creator of the Belarusian literature of the second half of the twentieth century. Highlighted in it is the fact that Michas Stralcow was an extraordinarily talented man of letters who fully demonstrated his potential in prose, poetry and essay writing.